**Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Партызанскага раёна г. Мінска**

**ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Вікторыя”
г. Мінска”**



# Праект
# “Таямніцы беларускай хаты”
**(з вопыту рэалізацыі праекта на базе этнаграфічнага музея
“Бацькава гняздо”)**

**Намінацыя “Праект па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню”
(узрост удзельнікаў 11-13 гадоў)**

**Складальнікі:**
**Вараб’ева Тамара Васільеўна,**
**метадыст вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі,**
**Лазоўская Людміла Сяргееўна,**
**метадыст першай кваліфікацыйнай катэгорыі,**
**Пыско Любоў Генадзьеўна,**
**педагог дадатковай адукацыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі**

**220037, г. Мінск**
**вул. Уральская,41**
**тэл.: 8-017-273-68-12**

**Мінск, 2022**

Прадстаўлены праект “Таямніцы беларускай хаты” з’яўляецца лагічным прадаўжэннем паспяхова рэалізаванага раней праекта “Усе мы родам з беларускай вескі”. Праект накіраваны на стварэнне ўмоў для грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў праз азнакамленне з малавывучанай сферай беларускай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры і яе сімвалічным значэннем.

Адрасавана педагогам, кіраўнікам музеяў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, а таксама ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Складальнікі:
Вараб’ева Тамара Васільеўна, метадыст; Лазоўская Людміла Сяргееўна, метадыст; Пыско Любоў Генадзьеўна, педагог дадатковай адукацыі.

220037, г. Мінск
вул. Уральская,41
тэл.: 8-017-273-68-12
Emal:parctdm@minskedu.gov.by

**Змест**

Уводзіны……………………………………………………………………..4
1. Метадалагічная характарыстыка праекта…………………………………6
2. Практычная рэалізацыя праекта па напрамках дзейнасці музея……………..12
Заключэнне……………………………………………………………………17
Спіс выкарыстанай літаратуры…………………………………………….....19
Дадатак…………………………………………………………………...…20
Дадатак 1. Дыплом XVIII Рэспубліканскай выставы навукова-метадычнай літаратуры, педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі……………21
Дадатак 2. Тэматыка інтэрактыўных экскурсій……………………………..22
Дадатак 3. Фота Дамавіка……………………………………………………..24
Дадатак 4. Рэфлексія экскурсіі…………………………………………………25
Дадатак 5. Слоўнік……………………………………………………………27
Дадатак 6. Фота біклагі………………………………………………………..29
Дадатак 7. Фота інтэрактыўных экскурсій…………………………………..30
Дадатак 8. Дыпломы за ўдзел у конкурсах…………………………………..31
Дадатак 9. Сцэнарый экскурсіі “Загадкі з Семежавай хаткі” ……………………33
Дадатак 10. Скрыншот анлайн-віктарыны ў Тэлеграм-канале “Партизанский образовательный”……………………………………………………………..58
Дадатак 11. Фота творчых сустрэч у музеі…………………………………..59
Дадатак 12. Відэарэпартаж на телеканале “ОНТ”……………………………...52
Дадатак 13. Фотапанарама тэматычных куткоў……………………………..63
Дадатак 14. Анкета і вынікі ўдзельнікаў праекта………………………………64

*Невялікая хата стаіць пры дарозе,*
*Я гляджу ў яе вокны праз галінкі бярозы.*
*У вокнах бачу дзяцінства сваё,*
*На душы мне зрабілася адразу цяпло".*

## Уводзіны

У сучасных умовах, з улікам рэфармавання сістэмы адукацыі, адной з асноўных задач педагогаў з'яўляецца як удасканаленне, актуалізацыя форм і метадаў грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў, так і пошук новых. Значная роля ў гэтым працэсе адводзіцца музеям устаноў адукацыі. Яны, з'яўляючыся адным са сродкаў дадатковай адукацыі, развіваюць сатворчасць, актыўнасць вучняў, маральныя прынцыпы, каштоўныя прыярытэты. Менавіта музеі ўстаноў адукацыі даюць магчымасць фарміраваць у навучэнцаў разуменне дзяржаўнай ідэалогіі як сістэмы каштоўнасцяў, выхоўваць такія якасці, як духоўнасць, патрыятызм, грамадская актыўнасць.

Ролю нашага музея "Бацькава гняздо" як нельга лепш выказваюць выдатныя словы Д.С. Ліхачова: "Любоў да роднага краю, да роднай культуры, да роднага сяла або да горада, да бацькоў, да роднай мовы, да сваёй сям'і, да свайго жылля, да сваёй школы паступова пашыраючыся, гэтая любоў пераходзіць да сваёй краіны".

На гэта быў накіраваны праект "Усе мы родам з беларускай вескі", які рэалізоўваўся на базе музея "Бацькава гняздо" [*Дадатак 1*].

Праект дазволіў сумесна з установамі адукацыі Партызанскага раёна г.Мінска аб'яднаць дзейнасць па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню

вучняў. Рэалізацыя праекта “Усе мы родам з беларускай вескі” праз інтэрактыўныя формы работы дазволіла стварыцць адкрытую культурна-выхаваўчую прастору, якасна абнавіць змест па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў, паглыбіць веды аб культурнай і гістарычнай спадчыне беларускага народа, развіць супрацоўніцтва і сатворчасць цэнтра “Вікторыя” і ўстаноў адукацыі раёна. Але для таго, каб патрыятызм далей быў сапраўднай асновай выхавання неабходны пастаянны пошук новых форм і метадаў грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў. Таму пасля рэалізацыі праекта “Усе мы родам з беларускай вескі” з’явіўся праект “Таямніцы беларускай хаты”. Ён накіраваны на цікавую і, на сённяшні дзень пакуль мала вывучаную, сферу беларускай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры. Яна вельмі багатая і разнастайная, бо бярэ свае вытокі ў далекім мінулым, у культуры старажытных славян. Аб’екты беларускай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры валодалі выдатнымі ўтылітарнымі ўласцівасцямі, мелі адметныя эстэтычныя рысы, таксама ў свядомасці людзей нярэдка набывалі якасці, якія павінны былі надаць таму ці іншаму прадмету побыту працоўнай дзейнасці чалавека магічную сілу. Інымі словамі аб’екты матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага селяніна мелі яшчэ і сімвалічны сэнс. Свет рэчаў ва ўсе часы быў арганічна звязаны з сацыяльным і духоўным жыццём чалавека.

Трэба адзначыць, што адметнасцю даннага праекта з’яўляецца тое, што вывучаецца матэрыяльна-мастацкая культура в.Семежава, якая адносіцца да Капыльска-Клецкага строю, гэта дазваляе захаваць матэрыяльна-мастацкую спадчыну цэнтральнай часткі Беларусі.

## 1. Метадалагічная характарыстыка праекта.

Праект “Таямніцы беларускай хаты” дазваляе стварыць умовы для грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў праз азнакамленне з малавывучанай сферай беларускай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры і яе сімвалічным сэнсам.

Дадзены праект распрацаваны на выснове наступных дакументаў:

- Кодэкса аб адукацыі Рэспублікі Беларусь;
- Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь;
- Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь.

**Канцэпцыя праекта**

Педагагічная канцэпцыя (устаноўка) праекта грунтуецца на стварэнні гуманістычнай, асабіста-арыентаванай адукацыі сістэмы грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў сродкамі музейнай педагогікі.

Праект носіць адкрыты характар, ён дазваляе дапаўняць, удасканальваць, выбіраць розныя формы работы з навучэнцамі па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню, выкарыстоўвая магчымасці этнаграфічнага музея «Бацькава гняздо». Рэалізацыя праекта будуецца на выснове правядзення інтэрактыўных тэматычных экскурсій.

**Асноўныя прынцыпы рэалізацыі праекта.**

- прынцып гуманізацыі: мяркуе гуманныя, беражлівыя адносіны да дзяцей, іх самакаштоўнасці і іх інтарэсаў;

- прынцып дэмакратызацыі: саздае ўмовы для развіцця актыўнасці і ініцыятыўнасці;
- прынцып адкрытасці: удзел у рэалізацыі праекта максімальнай колькасці ўдзельнікаў;
- прынцып развіваючага, творчага, сацыяльна-значнага характара дзейнасці, у якім удзельнічаюць дзеці і падлеткі.
- прынцып самаразвіцця: азначае, што праект валодае такімі ўласцівасцямі, якія дазваляюць уносіць у ходзе яго рэалізацыі змены.

**Мэта праекта:** стварэнне ўмоў для грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў праз азнакамленне з малавывучанай сферай беларускай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры і яе сімвалічным сэнсам.

**Задачы:**

- паглыбіць веды навучэнцаў пра аб'екты матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа;
- азнаёміць з сімвалічным сэнсам аб'ектаў матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа;
- пазнаёміць навучэнцаў з сялянскім побытам, асноўнымі рэчамі, іх ужываннем і выкарыстаннем у сялянскай хаце;
- выхоўваць беражлівыя адносіны да гістарычнага мінулага матэрыяльна- мастацкай культуры беларускага народа;
- развіваць цікавасць да пошуку навукова-пазнавальнай дзейнасці ў краязнаўчай працы.

**Аб'ект праекта:** працэс грамадзянскага і патрыятычнага выхавання.

**Прадмет праекта:** інтэрактыўныя формы і метады работы ў рамках дзейнасці этнаграфічнага музея "Бацькава гняздо".

**Метады рэалізацыі праекта:**

- *тэарэтычныя* – аналіз літаратуры, нарматыўных дакументаў аб адукацыі па пытаннях грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў у рамках музейнай дзейнасці, сістэмны аналіз, абагульненне прадуктыўнага педагагічнага вопыту;

- *эмпірычныя* – маніторынг, інфармацыйна-мэтавы аналіз інфармацыйных і дакументальных крыніц.

**Тэрмін дзеяння праекта:** жнівень 2021 - май 2023 г.

**Удзельнікі праекта:** педагогі Цэнтра і ўстаноў адукацыі, навучэнцы Цэнтра і адукацыйных установ раёна.

**Этапы рэалізацыі пректа:** падрыхтоўчы этап, асноўны этап, заключны этап.

**Падрыхтоўчы этап**

Мэта: стварэнне ўмоў для рэалізацыі праекта.

Тэрмін: жнівень - верасень 2021.

| № | Змест дзейнасці | Тэрмін |
|---|---|---|
| 1 | Стварэнне творчай групы праекта | Жнівень 2021 |
| 2 | Вывучэнне праблемы | Жнівень 2021 |
| 3 | Вылучэнне ідэі праекта | Жнівень 2021 |
| 4 | Распрацоўка праекта | Жнівень 2021 |
| 5 | Вывучэнне мэтавай аўдыторыі праекта | Жнівень 2021 |
| 6 | Усталяванне сувязяў з адпаведнымі ўстановамі:<br>- упраўленне па адукацыі адміністрацыі Партызанскага раёна г. Мінска;<br>- установы адукацыі раёну;<br>- Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь;<br>- Беларускі народны музей народнай архітэктуры і быта;<br>- Дом культуры в. Семежава | Верасень 2021 |
| 7 | Інфармацыйная рэклама праекта на сайце Цэнтра, устаноў адукацыі раёна, сацыяльных сетках | Верасень 2021 |
| 8 | Падрыхтоўка экспазіцый музея да рэализацыі праекта | Верасень 2021 |

| | | |
|---|---|---|
| 9 | Прыцягненне кадравых, тэхнічных, інфармацыйных матэрыяльных рэсурсаў | Верасень 2021 |
| 10 | Аналіз дзейнасці па рэалізацыі падрыхтоўчага этапа | Верасень 2021 |

**Асноўны этап**

Мэта: рэалізацыя праекта.

Тэрмін: кастрычнік 2021 - сакавік 2023.

| № | Змест дзейнасці | Тэрмін |
|---|---|---|
| 1 | Рэалізацыя асноўных мерапрыемстваў праекта: правядзенне інтэрактыўных экскурсій, лекцый, заняткаў, майстар-класаў | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |
| 2 | Арганізацыя і правядзенне метадычных мерапрыемстваў | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |
| 3 | Удзел у метадычных мерапрыемствах у раёне, горадзе, рэспубліцы па напрамках дзейнасці праекта | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |
| 4 | Пошук новых аб’ектаў матэрыяльна-мастацкай культуры | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |
| 5 | Афармленне новых экспазіцый матэрыяльна-мастацкай культуры | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |
| 6 | Асвятленне дзейнасці ў рамках рэалізацыі праекта ў інтэрнэце, сацыяльных сетках, СМІ | Кастрычнік 2021-сакавік 2023 |

| | | |
|---|---|---|
| 7 | Распрацоўка метадычных матэрыялаў і рэкамендацый па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў | Кастрычнік 2021 - сакавік 2023 |
| 8 | Развіцце музейнага фонда, абнаўленне экспазіцый музея | Кастрычнік 2021 - сакавік 2023 |
| 9 | Правядзенне аператыўнай рэфлексіі праекта | Кастрычнік 2021 - сакавік 2023 |
| 10 | Правядзенне маніторынгу рэалізацыі асноўнага этапа праекта | Сакавік 2023 |

**Заключны этап**

Мэта: аналіз вынікаў праекта.

Тэрмін: красавік-май 2023.

| № | Змест дзейнасці | Тэрмін |
|---|---|---|
| 1 | Правядзенне выніковага маніторынгу праекта | Красавік 2023 г. |
| 2 | Складанне аналітычнай даведкі па выніках маніторынгу | Красавік 2023 г |
| 3 | Абагульненне вынікаў праекта | Красавік 2023 г |
| 4 | Аналіз перспектыў выкарыстання вынікаў праекта ў грамадзянскім і патрыятычным выхаванні навучэнцаў | Красавік 2023 г |
| 5 | Арганізацыя і правядзенне семінара-прэзентацыі “Праектная дзейнасць па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню ў рамках музейнай дзейнасці” | Май 2023 г. |
| 6 | Камплектаванне банка інфармацыйна-метадычных матэрыялаў, рэкамендацый і дапаможнікаў па | Май 2023 г. |

| | | |
|---|---|---|
| | грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў у рамках музейнай дзейнасці | |
| 7 | Прагназаванне перспектыў развіцця праектнай дзейнасці па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў на базе этнаграфічнага музея “Бацькава гняздо” | Май 2023 г. |

**Рэсурсы праекта:**

- *кадравыя*: кіраўнік этнаграфічнага музея “Бацькава гняздо”, педагогі Цэнтра, метадысты, рэжысёр, культарганізатары;
- *тэхнічныя*: памяшканне этнаграфічнага музея “Бацькава гняздо”, экспанаты музея, аудыя- і відэаапаратура, камп’ютары, мультымедыа, аргтэхніка;
- *матэрыяльныя*: бюджэтныя сродкі, пазабюджэтныя сродкі, спонсарская дапамога;
- *інфармацыйныя*: інтэрнэт, сайт, СМІ, матэрыялы з вопыту работы, метадычная прадукцыя.

**Чаканыя вынікі:**

- якаснае абнаўленне зместа і форм работы па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў сродкамі музейнай педагогікі;
- паглыбленне ведаў навучэнцаў праз аб’екты матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа;
- фарміраванне прадстаўлення аб сімвалічным сэнсе аб’ектаў матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа;

- набыццё навучэнцамі ведаў пра сялянскі побыт, асноўныя рэчы, іх ужыванне і выкарыстанне ў сялянскай хаце;
- беражлівыя адносіны да гістарычнага мінулага, матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа;
- развіцце цікавасці да пошуку навукова-пазнавальнай дзейнасці ў краязнаўчай працы;
- развіцце этнаграфічнага музея "Бацькава гняздо", яго фонда і экспазіцый;
- папаўненне фонда сцэнарных распрацовак, медыятэкі;
- узмацаванне супрацоўніцтва з музеямі, архівамі, бібліятэкамі.

**2. Практычная рэалізацыя праекта па напрамках дзейнасці музея.**

Рэалізацыя праекта вядзецца па наступным напрамкам дзейнасці: арганізацыйна-пашуковай, экскурсійна-асветніцкай, метадычна-кансультатыўнай, матэрыяльна-тэхнічнай.

**Арганізацыйна-пашуковая дзейнасць.**

Адным з важных накірункаў дзейнасці па рэалізацыі праекта з'яўляецца *арганізацыйна-пашуковая дзейнасць.* У самым пачатку праводзілася актыўная работа творчай групы па рэкламна-інфармацыйнаму суправаджэнню праекта: інфармацыя з'явілася на сайце Цэнтра і сайтах устаноў адукацыі Партызанскага раёна г. Мінска, сацыяльных сетках. На нарадзе намеснікаў дырэктароў па выхаваўчай рабоце адбылася размова па арганізацыі праекта. Затым быў зроблены загад па ўпраўленню адукацыі Партызанскага раёна г. Мінска па фарміраванню груп навучэнцаў ва ўзросце 11-13 гадоў ад кожнай установы адукацыі, якія сталі ўдзельнікамі праекта.

У пачатку кожнага навучальнага года ў рамках праекта састаўляецца графік правядзення тэматычных экскурсій, майстар-класаў, заняткаў.

Развіваецца пашуковая дзейнасць, збор рэчаў матэрыяльнай культуры. Да гэтай дзейнасці далучыліся не толькі ўдзельнікі праекта (навучэнцы і педагогі), але і бацькі, дзядулі і бабулі, што дазволіла значна павялічыць музейны фонд.

**Экскурсійна-асветніцкая дзейнасць.**

Адным з самых важных накірункаў дзейнасці ў рэалізацыі праекта з'яўляецца *экскурсійна-асветніцкая дзейнасць*. Згодна з тэматыкай праекта былі распрацаваны інтэрактыўныя экскурсіі па наступным тэмам:

- "Свет роднай хаты";
- "Жывой рэчы чараўніцтва";
- "З працай і жыцце лягчэй";
- "Пазычана ў прыроды"
- "Свет жывых рэчаў" [*Дадатак 2*].

Гэтыя тэмы ў сваю чаргу разбіваюцца на падтэмы.

Напрыклад тэма 1:

- “Свет роднай хаты”:

    1.1. “Хата мой сусвет”.

    1.2. “Кум з кумою на покуцці сядзяць”.

    1.3. “Дай божа радасць пад вашу столь”.

    1.4. “Добрая доля - з печы пламенем”.

    1.5. “Аконца на ўсход сонца”.

    1.6. “Ля бацькоўскага парога”.

Так, за час рэалізацыі праекта адбылося 30 інтэрактыўных экскурсій, якія дазваляюць паглыбіць веды ўдзельнікаў пра аб’екты матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа. Экскурсіі праводзяць Гаспадыня хаты і Дамавік [*Дадатак 3*].

Напярэдадні экскурсіі афармляецца тэматычны куток, падбіраюцца рэчы, якія будуць удзельнічаць пад час яе правядзення. У пачатку экскурсіі Гаспадыня хаты вітае ўдзельнікаў праз загадкі і прыказкі, аб’яўляе тэму і пачынае дзеянне. Гаспадыня хаты распавядае пра рэчы, якімі яны карысталіся, іх гісторыю, прызначэнне, а таксама пра лёсы людзей, легенды і паданні. Затым з’яўляецца Дамавік, які з гумарам вітае ўдзельнікаў і пачынае загадваць па тэме экскурсіі творчыя заданні. У канцы экскурсіі праводзіцца рэфлексія і вынікі [*Дадатак 4*].

Трэба адзначыць, што любая музейная рэч – гэта гісторыя чалавека, сям’і, рода. І таму, ў час экскурсіі ў адпаведнасці з тэмай, “ажыўляюцца” рэчы: “барылка”, “біклага”, “бойка”, “верацёны”, “вілкі”, “жлукта”, “калаўрот”, “кросны”, “люлька”, “начоўкі” і г.д. [*Дадатак 5*].

У час правядзення інтэрактыўных экскурсій з дапамогай музейных рэчаў ажыццяўляецца цікавая вандроўка ў мінулае. Так, напрыклад, удзельнікі праекта знаёміліся з біклагай (баклагай) - бандарны, ганчарны і нават жасцяны выраб з двух донцаў, ёмістасцю 5-10 літраў па тэме “Жывой рэчы чараўніцтва” [*Дадатак 6*]. У музеі прадстаўлены розныя біклагі. Навучэнцы даведаюцца, што ў семежаўцаў былі вялікія гаспадаркі, да і худобы шмат, таму ў час сенакосу ўся сям’я на цэлы дзень шла на пакос. Вось тут і былі неабходныя біклагі: для вады, квасу, кіслага малака. Семежаўцы былі зажытачнымі, таму і

біклагі былі жасцяныя. Але трэба адзначыць, што рабілі і драўляныя, але толькі з дуба, які валодае антысептычнымі і зберагальнымі якасцямі.

Адной з асаблівасцей рэалізацыі праекта з'яўляецца тое, што можна чапаць любыя рэчы: пасядзець на ложку і лаве, патрымаць жбан і хамут, пакруціць жарнава, разгледзець маслабойку. Таксама можна памераць адзенне, перабраць рушнікі, пасядзець за кроснамі, саткаць ніці на "скулах" і "верацёнах" [*Дадатак 7*].

Вось гэтак, праз далучэнне да старадаўніх рэчаў, якія зберагаюць працу і цяпло людзей іх зрабіўшых ці імі карыстаўшыхся, адбываецца дакрананне навучэнцаў да беларускай матэрыяльна-мастацкай спадчыны.

Трэба падкрэсліць, што ў час рэалізацыі праекта шмат увагі надаецца правядзенню ў музеі заняткаў гурткоў, майстар-класаў, выставак творчых работ навучэнцаў і педагогаў.

**Метадычна- кансультацыйная дзейнасць.**

Значную ролю ў рэалізацыі праекта займае *метадычна-кансультацыйная* дзейнасць. Творчая група праекта, у якую ўваходзяць кіраўнік музея, метадысты, распрацоўвае змест для тэматычных экскурсій, лекцый, гутарак, праводзіць кансультацыі для педагогаў Цэнтра і ўстаноў адукацыі раёна па правядзенню мерапрыемстваў, заняткаў з краязнаўчай, патрыятычнай тэматыкай, распрацоўвае праграмы аб'яднанняў па інтарэсах па музеязнаўству, краязнаўству. Пастаянна папаўняецца бібліятэка музея, у прыватнасці кнігамі з асабістых бібліятэк семежаўцаў, ёсць нават экзэмпляры XVIII-XIX стагоддзяў.

У ходзе рэалізацыі праекта сістэматызаваны тэматычныя папкі з матэрыяламі па прыладах працы, хатняму побыту, адзенню, посуду, дыванам і г.д. Таксама творчая група звярталася за кансультацыямі да спецыялістаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, Беларускага народнага музея народнай архітэктуры і быта, Дома культуры ў в. Семежава, рыхтаваліся матэрыялы з вопыту работы для ўдзелу ў конкурсах. Падчас рэалізацыі праекта прынялі ўдзел у гарадскіх конкурсах у рамках рэспубліканскай акцыі "Я гэты край Радзімаю заву":

- конкурс этнаграфічных музеяў устаноў адукацыі (ІІІ месца ў горадзе);
- конкурс юных экскурсаводаў (ІІ месца на горадзе);
- конкурс “Лепшая метадычная распрацоўка музея” (дыплом удзельніка);
- конкурс “Сцяжынкамі бацькаўшчыны” (І-е месца ў горадзе) [*Дадатак 7*].

Значная роля ў рэалізацыі праекта адводзіцца сайту музея “Бацькава гняздо” (https://virtmuzei.parctdm.minskedu.gov.by/), дзе размешчаны метадычныя матэрыялы, віртуальныя экскурсіі, фота- і відэаматэрыялы [*Дадатак 9*]. Даступны да прагляду на сайце музея дэмаролік аб музейных рэчах, які быў падрыхтаваны да конкурсу юных экскурсаводаў музеяў устаноў адукацыі. Міні-экскурсія ў фармаце відэароліка даступна да прагляду ўсім жадаючым у інтэрактыўнай форме, дзе ідзе размова аб сямі музейных рэчах. Таксама на сайце ёсць поўны сцэнарый тэатралізаванага занятку “Дуб і Крумкач”, які прыняў удзел у конкурсе на лепшую метадычную распрацоўку, які будзе цікавы педагогам па арганізацыі інтэрактыўнай дзейнасці з навучэнцамі па патрыятычнаму выхаванню. Таксама метадыстамі Цэнтра кожную нядзелю праводзіцца анлайн-віктарына ў Тэлеграм-канале “Партизанский образовательный” на веданне музейных рэчаў і вобласці іх прымянення ў сялян. Там размяшчаюцца фота музейных рэчаў з мінімальнай інфармацыяй і варыянтамі адказаў. Адказы на пытанні размяшчаюцца на наступны дзень [*Дадатак 10*].

Частымі наведвальнікамі музея з’яўляюцца слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі і перападгатоўкі кадраў ДУА “Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі”, ДУА “Акадэмія паслядыпломнай адукацыі”, “Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі”, пастаяннадзеючага семінару для педагогаў адукацыі Партызанскага раёна г. Мінска. За час рэалізацыі праекта адбылося 15 творчых сустрэч у музеі, у якіх прынялі ўдзел больш за 300 педагогаў з усіх куткоў Беларусі, а таксама Расіі і Германіі [*Дадатак 11*].

Пастаянна на базе музея адбываюцца пасяджэнні метадычных аб’яднанняў педагогаў па напрамках дзейнасці.

Па выніках рэалізацыі праекта будзе падрыхтавана тэматычная папка з метадычнымі матэрыяламі.

Трэба адзначыць, што ў час рэалізацыі праекта было арганізавана супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі: часопісам “Минская школа сегодня”, газетамі “Настаўніцкая газета”, “Вечерний Минск”, “Минский курьер”, а таксама ўдзел у перадачах на тэлебачанні [*Дадатак 12*].

**Матэрыяльна-тэхнічная дзейнасць.**

Значную ролю ў рэалізацыі праекта займае яго разнастайная *матэрыяльна-тэхнічная дзейнасць*. Трэба адзначыць, што ў ходзе рэалізацыі праекта ўдаскладнялася і пашыралася матэрыяльна-тэхнічная база, выраблялiся стэнды, вітрыны, макеты. Да кожнай тэмы інтэрактыўных экскурсій афармляліся тэматычныя куткі, такія як “Свет роднай хаты”, “Жывой рэчы чараўніцтва”, “Жыцце пражыць - не поле перайсці”, “З працай і жыцце лягчэй”, “Свет жывых рэчаў” і г.д. [*Дадатак 13*]. Да іх падбіраліся рэчы з фонда музея, які папаўняўся новымі экспанатамі матэрыяльна-мастацкай культуры беларускай в. Семежава, такімі як “барылка”, “бойка”, “жлукта”, “начоўкі”, “калаўрот” і г.д. канца XIX-пачатку XX стагоддзя. На сённяшні дзень у фондзе музея 1150 экспанатаў, якія маюць важную культурную і гістарычную спадчыну.

У перспектыве стварэнне музейнай экспазіцыі “Бліны ды аладкі” да новага праекта, прысвечанага гісторыі і традыцыям беларускай народнай кухні.

## Заключэнне

У сучасных умовах у сістэме адукацыі адной з асноўных задач педагогаў з'яўляецца ўдасканаленне, актуалізацыя форм і метадаў грамадзянскага і патрыятычнага выхавання навучэнцаў, а таксама і пошук новых. Істотная роля ў гэтым працэссе адводзіцца музеям устаноў адукацыі.

Музейная педагогіка, як накірунак дзейнасці музея, дазваляе вырашыць адну з асноўных педагагічных задач: развіваць пачуццё любві да Радзімы, жаданне і імкненне вывучыць яе гісторыка-культурную спадчыну, сваі карані, свой род, далучыцца праз музей да гісторыі роднага края, горада, сяла, вёскі, сям'і.

Такім чынам, музейная педагогіка як адно з асноўных накірункаў дзейнасці музея, становіцца ўсё болей значнай у практыцы духоўна-маральнага, грамадзянскага і патрыятычнага, гісторыка-краязнаўчага выхавання асобы ў адзінай адукацыйнай прасторы.

Наш этнаграфічны музей "Бацькава гняздо" на працягу больш за 19 гадоў сваёй дзейнасці паспяхова развівае цікавасць да гісторыі, культуры, традыцый малой Радзімы, які потым з часам пераходзіць у любоў да сваёй краіны.

Рэалізацыя праекта паказала, што беларуская народная матэрыяльна-мастацкая культура мае глыбінныя сувязі з культурай многіх народаў света і нясе ў сабе элементы найстаражытнейшых культурных традыцый. Разам с тым яна ўяўляе сабой яркую самабытную з'яву, якая ўзнікла на аснове гуманістычнай, духоўнай культуры мінулага беларускага народа. Праект «Таямніцы беларускай хаты» праз інтэрактыўныя экскурсіі і формы работы дазваляе якасна абнаўляць змест і формы работы па грамадзянскаму і патрыятычнаму выхаванню навучэнцаў сродкамі музейнай педагогікі, паглыбляць веды навучэнцаў пра аб'екты матэрыяльна-мастацкай культуры беларускага народа, беражліва адносіцца да гістарычнага мінулага, развіваць інтарэс да пошуку, навукова-пазнавальнай дзейнасці, краязнаўчай рабоце,

развіццю этнаграфічнага музея «Бацькава гняздо», яго фонда і экспазіцый, узмацаванню супрацоўніцтва з музеямі, архівамі, бібліятэкамі, установамі адукацыі [*Дадатак 14*].

У перспектыве распрацоўка праекта «Бліны ды аладкі», накіраванага на вывучэнне гісторыі і традыцый беларускай народнай кухні, якая таксама з’яўляецца значнай часткай агульнай гісторыі беларускага народа.

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021-2025 гг.: Точка доступа https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf

2. Буенок, А. Народные обряды и праздники /А.Буенок. - СПб.: Тригон,2004.-383с.

3. Котович, О.В. Золотые правила народной культуры / О.Котович, Я.Крук-4-е изд.-Минск: Адукацыя і выхаванне, 2010-592с.

4. Крук, У.У. Пятніца / У.У.Крук // Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік/рэд. С.Санько (гал.рэд.) [і інш]; склад. І. Клімовіч.-2-е выд., дап-Мінск: Беларусь, 2006.-409 с.

5. Крук, Я. Колесо времени: традиции и современность/ Я.Крук, О.Котович.- 3-е изд., испр. и доп.-Минск: Беларусь. 2010.-350 с.

6. Крук, Я. Символика Беларускай народнай культуры / Я.Крук.-Минск: Беларусь, 2011-430 с.

7.Ленсу, Я. Ю. Сімволіка рэчавого асяродзя як элемент духоўнага свету беларускага народа/Я.Ю. Ленсу - Мінск: Выд. МіК, 2007.-144с.

8. Ленсу, Я.Ю. Таямніцы беларускай хаты / Я.Ю. Ленсу- Мінск. Беларусь, 2007.-167с.

# Дадатак

Дадатак 1. Дыплом XVIII

Рэспубліканскай выставы

навукова-метадычнай літаратуры,

педагагічнага вопыту і творчасці навучэнскай моладзі



МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

XVIII РЕСПУБЛИКАНСКАЯ ВЫСТАВКА
НАУЧНО-МЕТОДИЧЕСКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ,
ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОПЫТА
И ТВОРЧЕСТВА УЧАЩЕЙСЯ МОЛОДЕЖИ

ДИПЛОМ

III степени

НАГРАЖДАЕТСЯ

Пыско Любовь Геннадьевна,
педагог дополнительного образования
Центра дополнительного образования детей и молодежи
«Виктория» г. Минска,

за разработку материала
«Спадчына Беларусі – спадчына свету»

Заместитель Министра образования Р.С. Сидоренко

Минск, 2019

Дадатак 2. Тэматыка
інтэрактыўных экскурсій.

**Тэматычныя інтэрактыўныя экскурсіі праекта**
**“Таямніцы беларускай хаты”**

“Сярод хаты Сямён ляжыць”
(Бэлька)

Тэма 1. “Свет роднай хаты”:

1.1. “Хата – мой сусвет”;
1.2. “Кум з кумой на покуці сядзіць”;
1.3. “Дай божа, радасць пад вашую столь”;
1.4. “Добрая доля – з печы пламенем”;
1.5. “Аконца на ўсход сонца”;
1.6. “Ля бацькоўскага парога”.

“Пад адной шапкай чатыры панічкі жывуць”
(Стол)

Тэма 2. “Жывой рэчы чараўніцтва”:

2.1. “Пан беларускай хаты”;
2.2. “Залаты кубак”;
2.3. “Гары, свечка”;
2.4. “Свет на лопасці прасніцы”;
2.5. “Жавароначкі прыляцелі”;
2.6. “Па адзенні сустракаюць”;
2.7. “Сонечнае кола”;
2.8. “Юпітэр і беларуская прасніца”;
2.9. “Жывое ўзорачча”;
2.9.1. “Зорка на небе – месяц за хмарай”;
2.9.2. “Цур нас ад нячыстага”.

“У мае выразана, гладка вычасана”

(Дудка)

Тэма 3. “Жыццё пражыць - не поле перайсці”:

3.1. “Нарадзіўся чалавек”;

3.2. “Яна і ён”;

3.3. “Калі пайду за любага – яму хустачка шаўковая”;

3.4. “Будні і святы”;

3.5. “А смерць прыйдзе – паміраць будзем”;

“Чым я больш кручуся, тым я больш таўсцею”

(Верацяно)

Тэма 4. “З працай і жыццё лягчэй”:

4.1. “Каб прылада па руцэ”;

4.2. “Прасіўся снапочак у стадолу”;

4.3. “Свечка за здароўе худобы”;

4.4. “Каваль куе, а жалеза пяе”;

4.5. “Усё перамелецца – мука будзе”;

4.6. “Тут стаяла лазня дубовая”;

4.7. “Калодзец, калодзец, дай вады напіцца”.

Тэма 5. “Пазычана ў прыроды”:

5.1. “Дубочак-сынуля”;

5.2. “Дрэва – жыццё беларуса”.

“На полі Ярох рассыпаў гарох,

стала світаць, няма чаго збіраць”

(Зоркі)

Тэма 6. “Свет жывых рэчаў”:

6.1. “Рэчы – сімвалічная сувязь паміж людзей”.

Дадатак 3. Фота Дамавіка.






# Як прайшла экскурсія па музею



Цікава!



Роўна!



Сумна!

Дадатак 5. Слоўнік.

## Тлумачальны слоўнік.

“Абрус” – тканое изделие (из 1 или 2 сшитых полотенец), которым покрывали стол.

“Андарак” - юбка с пришивным лифом.

“Барылка” – бондарное изделие, бочонок, в котором брали воду в поле, на сенокос и т.д.

“Біклага” – бондарное изделие; 2-донный плоский бочонок, в котором носили воду.

“Бойка” (маслобойка) - посуда для сбивания масла в домашних условиях.

“Бурка” – длинная верхняя мужская одежда прямого кроя с башлыком и хлястиком из темного домотканого валяного сукна. Надевали на кожух или свитку.

“Верацёны” – приспособление для ручного прядения льна, шерсти, пеньки.

“Вілкі” – домашний печной инвентарь.

“Грэбень” - приспособление для чесания льна.

“Даёнка” – бондарное изделие, посуда для доения коров в крестьянском быту.

“Жлукта” – бондарное изделие в быту белорусов, в котором замачивали белье.

“Жорны” – ручная мельница, приспособленная для ручного помола.

“Збан” – гончарное изделие для хранения молока и др. продуктов.

“Кадушка” – бондарное изделие в форме усеченного конуса для воды и продуктов питания (квашения капусты, огурцов, муки и др.)

“Камякі” – традиционное белорусское блюдо: сваренный, толченый картофель, заправленный салом поджаренным с луком.

“Калаўрот” - приспособление для ручного прядения льна, пеньки, шерсти.

“Качалкі” – приспособление для глажения, прокатывания самотканых, преимущественно льняных изделий.

“Клець” - традиционная крестьянская постройка для хранения зерна, продуктов, одежды; часть белорусской хаты или строение возле нее.

“Кош” – полушарообразное плетенное из лозы, ракиты, сосновых или еловых корней изделие с дужкой. Предназначалось для переноски картофеля, овощей и др.

“Кросны” – станок для домашнего ткачества.

“Крынка” – гончарное изделие, высокий глиняный сосуд с выпуклыми боками и слегка суженым, но более широким, чем дно горлом.

“Куфар” – вид мебели в народном быту; деревянная емкость с покатой или плоской крышкой на шарнирах, где хранили ткани, одежду, белье и ценности.

“Лапці” – традиционная сельская обувь, плетеная с лыка, лозы или тонких веревочек.

“Люлька” – предмет народной мебели, детская кроватка.

“Макацёр” – гончарное изделие: похожая на глубокую миску глиняная ёмкость для растирания пестом мака, льняного и конопляного семени, творога, вареного картофеля и др.

“Матавіла” – приспособление, при помощи которого свивают нитки в мотки и разматывают с мотков.

“Начоўка” – корыто с широким открытым верхом, предназначалось для стирки белья, приготовления капусты, мяса для колбас.

“Пранік” – плоский деревянный брусок с ручкой для стирки белья и отбивания льна, проса.

“Прасніца” - деревянное приспособление для прядения шерстяного, льняного волокна.

“Ручнік” – продолговатый кусок ткани бытового и традиционно-обрядового назначения; вид художественной ткани.

“Сявенька”- короб для ручного сева.

“Скобля” – инструмент, предназначенный для снятия коры с дерева.

“Сурвэтка” – тканое, плетеное, или вышитое изделие (из льна, хлопка, шёлка) для украшения жилого интерьера.

“Сукала” - приспособление для наматывания ниток на цевку.

“Сякера” – топор, универсальное приспособление для обработки дерева и других материалов.

“Фіранкі” – изделия для завешивания и украшения окон.

“Цэп” – примитивное деревянное приспособление, которым молотили зерновые.

“Чапец” – традиционный женский головной убор – полушаровидная или плоская присобранная на затылке шапочка с ушками, к которым привязывались ленточки для завязывания.

“Хата” – жилое преимущественно срубленное из дерева строение белорусов.

Дадатак 6. Фота біклагі.



Дадатак 7. Фота інтэрактыўных экскурсій







Дадатак 8. Дыпломы за ўдзел у конкурсах.



РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

КОМИТЕТ ПО ОБРАЗОВАНИЮ МИНГОРИСПОЛКОМА

ДИПЛОМ

*Награждается*

Подгруша Андрей
ГУО «Центр дополнительного образования детей
и молодежи «Виктория» г.Минска»
руководитель Воробьева Т.В.

за **I место**
в номинации «Летопись родного края»
городского этапа республиканской экологической
акции «Сцяжынкамі Бацькаўшчыны»

Первый заместитель
председателя Л.М.Борисенко

г.Минск, 2022 год

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ

КОМИТЕТ ПО ОБРАЗОВАНИЮ МИНГОРИСПОЛКОМА

# ДИПЛОМ

НАГРАЖДАЕТСЯ

***Рахман Даниил,***

учащийся ГУО ЦДОДиМ «Виктория» г. Минска
*(руководитель Пыско Любовь Геннадьевна)*

***За II место***

городского этапа республиканского конкурса
юных экскурсоводов музеев учреждений образования
в рамках республиканской акции
**«Я гэты край Радзімаю заву»,**
номинация «Музейная мозаика»

Председатель комитета Н.В. Проскурова

*г. Минск, 2021*

Дадатак 9. Сцэнарый экскурсіі
“Загадкі з Семежавай хаткі”.

Комитет по образованию Мингорисполкома

Управление по образованию администрации Партизанского района

г. Минска

Государственное учреждение образования

«Центр дополнительного образования детей и молодежи «Виктория»

г. Минска»

Республиканская акция «Я гэты край Радзімаю заву»

Городской этап республиканского конкурса юных

экскурсоводов музеев учреждений образования

Номинация «Музейная мозаика»

# Экскурсия

# «Загадкі з Семежавай хаткі»

**Разработана:** Рахман Даниил, 16 лет,

объединение по интересам “Актерское мастерство”,

**Автор:** Пыско Любовь Геннадьевна,

педагог дополнительного образования,

+37529 5723294

Минск, 2021

## Содержание

1. Введение……………………………………………………………………….3
2. Основная часть. Экскурсия «Загадкі з Семежавай хаткі»………………… 4
3. Заключение……………………………………………………………………...9
4. Список литературы……………………………………………………………..11
5. Приложения 1 Легенды о Семежево……………………………………………..12
